583.qxd 8/29/2014 1:56 AM Page 1 (3,1)

Веcткі й Паведамленьні

інфармацыйны бюлетэнь Згуртаваньня “ПАГОНЯ”

Viestki j Paviedamlenni

Сусьветнае сеціва: e-krama.com, pahonia.com
Электронны адрас: viestki@mail.com
P. O. Box 3225, Farmingdale, NY 11735

№ 9 (583)
Верасень 2014 г.

# Беларусь - ЗША: 20 гадоў пасьля

У апошні час СМІ Беларусі, а таксама прадстаўнікі лукашэнкавага кіраўніцтва, усё часьцей згадваюць нармалізацыю беларуска-амэрыканскіх стасункаў.

У пацьверджаньне гэтага тэзісу яны прыводзяць важнейшыя падзеі апошніх гадоў, сярод якіх:

- скасаваньне санкцыяў ЗША ў дачыненьні да кампаніяў “Белтэхэкспарт” і “БелАМА” ў 2013 годзе;

- удзел Беларусі ў Паўночнай разьмеркавальнай сетцы, па якой забясьпечваецца кантынгент НАТО ў Аўганістане (праз Беларусь ідзе чыгуначны транзыт);

- павышэньне ўзроўню і інтэнсіўнасьці дыпляматычных кантактаў: тут узгадваюцца, як правіла, сустрэча экс-кіраўніка беларускага МЗС С. Мартынава з амэрыканскім калегам Г. Клінтан на саміце АБСЕ ў 2010 годзе, візыты кангрэсмэнаў і прадстаўнікоў амэрыканскага бізнесу ў 2010- 2011 гадох і, безумоўна, прыезд у Менск памочніка дзяржсакратара ЗША Эрыка Рубіна ў сьнежні 2013 году.

Акрамя гэтага, у пачатку ліпеня сёлета амбасада ЗША ў Менску аб’явіла аб аднаўленьні выдачы візаў J-1 для беларускіх студэнтаў, якія наведваюць ЗША ў рамках праграмаў абмену, а таксама аб зьніжэньні кошту візаў для ўсіх грамадзянаў.

Нарэшце, 30 ліпеня 2014 году міністар замежных справаў Беларусі Ўладзімер Макей прыняў новага часовага паверанага ў справах ЗША ў Беларусі Скота Ролянда, а таксама высока ацаніў унёсак у разьвіцьцё двухбаковых адносінаў ягонага папярэдніка Ітана Голдрыча. Нягледзячы на тое, што сустрэча насіла шмат у чым пратакольны характар, яна была шырока асьветленая на экранах дзяржаўных тэлеканалаў.

Безумоўна, усе пазытыўныя зьмены ў беларуска-амэрыканскіх дачыненьнях дзяржаўная прапаганда прыпісвае на карысьць афіцыйнага кіраўніцтва краіны і асабіста Лукашэнкі, маўляў, граматная палітыка беларускага лідэра прывяла да ўсведамленьня амэрыканскім кіраўніцтвам беспэрспэктыўнасьці палітыкі санкцыяў і неабходнасьці наладжваньня сувязяў.

Але ці так гэта? Ці сапраўды ўзурпатар улады ў Беларусі змог “праламаць лёд” у двухбаковых дачыненьнях? Ці гэта міт, які раскручваюць дзяржаўныя СМІ напярэдадні чарговай выбарчай кампаніі?

Каб даць дакладны адказ на гэтае пытаньне, неабходна паглядзець на дынаміку міждзяржаўных дачыненьняў у пэрыяд кіраўніцтва А. Лукашэнкі. На момант ягонага прыходу да ўлады беларуска-амэрыканскія кантакты разьвіваліся інтэнсіўнымі тэмпамі:

- Амэрыка была 2-й краінай у сьвеце (пасьля Ўкраіны), якая прызнала незалежнасьць Рэспублікі Беларусь;

- бакі здолелі абмяняцца візытамі на вышэйшым узроўні: у 1993 годзе Вашынгтон наведаў тагачасны кіраўнік Вярхоўнага Савету Станіслаў Шушкевіч, а ў студзені 1994 году з афіцыйным візытам ў Менск прыехаў прэзыдэнт ЗША Біл Клінтан;

- у гандлі з ЗША Беларусі надалі рэжым найбольшага спрыяньня; краіны падпісалі дамову аб узаемнай абароне інвэстыцыяў і інш.

За 20 гадоў кіраваньня Лукашэнкі ўсе пазытыўныя дасягненьні былі зьведзеныя на нішто:

- па вядомай прычыне палітычныя кантакты былі замарожаныя, у дачыненьні да рэжыму ўвялі цэлы шэраг санкцыяў палітычнага і эканамічнага характару (у тым ліку супраць аднаго зь вядучых экспартэраў – канцэрну “Белнафтахім”); з моманту прыходу А. Лукашэнкі да ўлады не адбылося ніводнага двухбаковага візыту на вышэйшым дзяржаўным, урадавым альбо дыпляматычным узроўнях, калі не лічыць удзел А. Лукашэнкі ў сэсіях Генасамблеі ААН, але іх нельга разглядаць у кантэксьце двухбаковых адносінаў.

- аб’ём беларускага экспарту з 2006 году скараціўся больш чым у 7 разоў, з 445 да 71 млн даляраў; калі да 2007 году дынаміка гандлю Беларусі з ЗША была станоўчай, то да 2013 году адмоўнае сальда гандлёвага балянсу склала больш за 630 млн даляраў; іншымі словамі, амаль 90% гандлю з ЗША – гэта імпарт;

- быў паніжаны ўзровень дыпляматычнага прадстаўніцтва: на чале дыпмісіяў з 2008 году стаяць часовыя паверaныя ў справах, а консульскі аддзел амбасады ЗША ў Менску фактычна спыніў выдачу візаў для большасьці грамадзянаў Беларусі. сёньня Беларусь – адзіная краіна ў Эўропе, якая ня мае паўнавартасных дыпляматычных і консульскіх адносінаў з ЗША.

- штогадовы аб’ём амэрыканскіх інвэстыцыяў у беларускую эканоміку складае каля 130 млн даляраў (для параўнаньня, інвэстыцыі невялікай Рэспублікі Кіпр у эканоміку Беларусі перавышаюць 1 млрд даляраў).

Як бачна, падставаў для гонару ў беларускага кіраўніка няшмат. Акрамя іншага, неабходна адзначыць таксама нэгатыўную эмацыйную афарбоўку двухбаковых дачыненьняў. А. Лукашэнка ў апошнія гады ня раз дазваляў сабе вельмі рэзка выказвацца на адрас кіраўніцтва ЗША і амэрыканцаў агулам.

Так, у інтэрвію казахскаму каналу 24KZ Лукашэнка параўнаў амэрыканскую нацыю зь нямецкай часоў гітлераўскай Нямеччыны: “Амэрыканская нацыя, а я як гісторык, не магу асэнсаваць, што гэта за нацыя такая, якая прысвоіла сабе права нейкай выключнасьці. Мы гэтую выключнасьць у сярэдзіне мінулага стагодзьдзя перажылі, і яна каштавала 50 мільёнаў жыцьцяў”.

У інтэрвію таму ж тэлеканалу ён выказаўся з нагоды вельмі балючага для ЗША расавага пытаньня: “І наогул мяне Абама зьдзіўляе. Яшчэ нядаўна чарнаскурыя людзі ў Амэрыцы рабамі былі, а сёньня аб выключнасьці нейкай заяўляюць. Я ніколі ня думаў, што чалавек, які выйшаў з гэтых бедных слаёў, зможа наогул рыторыку такую ў сьвеце праводзіць”.

Такім чынам, зыходзячы з досьведу папярэдніх 20 гадоў, даволі складана казаць аб якой-небудзь нармалізацыі беларуска-амэрыканскіх дачыненьняў, калі супраца ва ўсіх сфэрах фактычна прыпынілася, а здароваму палітычнаму дыялёгу перашкаджаюць палітычныя амбіцыі і простае ігнараваньне элемэнтарных этычных нормаў.

**Станіслаў ГЕХТ**

583.qxd 8/29/2014 1:56 AM Page 3 (1,1)



# Жнівеньскі сход Згуртаваньня "Пагоня"

У суботу 9-га жніўня ў Цэнтральным парку на Мангэтане адбыўся чарговы жнівеньскі сход Беларуска-Амэрыканскага Згуртаваньня "Пагоня".

Удзельнікі сходу сабраліся каля базальтавых скалаў каля вялікага возера – маляўнічай мясьціны з хвойкамі й зялёнай травой. Мясьціна нечым нагадвае Беларусь, нават без вялікага напружаньня ўяўленьня.

Напачатку сходу сп. Віталь Зайка, старшыня Згуртаваньня "Пагоня", выступіў перад прысутнымі з інфармацыяй пра мэты і пляны "Пагоні". Для новых людзей распавеў пра дзейнасьць арганізацыі, яе імпрэзы і акцыі. Ён такама распаўсюдзіў сярод прысутных узоры друкаванай прадукцыі – календары і выпускі інфармацыйнага бюлетэня "Весткі й Паведамленьні".

Затым прысутныя прадставіліся і распавялі пра сябе і пра тое, чаго яны чакаюць ад беларускай арганізацыі на чужыне, якую дапамогу хацелі б атрымаць. Важнай зьяўляецца дапамога ў юрыдычнай сфэры, у справе дапамогі з працай і вучобай, нават на ўзроўні інфармаваньня.

Сп. В. Зайка заклікаў прысутных трымацца адзін аднаго, знаёміцца, абменьвацца інфармацыяй і падтрымліваць сваю арганізацыю ў Амэрыцы.

**Віталь ЗАЙКА**



# Сэктар Бел-Транс-Газа

У сувязі зь нядаўнім абвастрэньнем канфлікту паміж дзяржавай Ізраіль і часткай палестынскай тэрыторыі, што завецца Сэктар Газа, міжволі напрошваецца параўнаньне з падзеямі ў Беларусі – і цяпер, і падчас Другой сусьветнай вайны.

Напачатку трэба зрабіць кароткі экскурс у гісторыю ізраільска-палестынскага канфлікту, што пачаўся яшчэ да ўтварэньня дзяржавы Ізраіль у траўні 1948 году. У выніку іміграцыі гэбраяў у Палестыну, што знаходзілася перш пад турэцкім, а з 1918 году – пад брытанскім кіраваньнем (мандатам Лігі Нацыяў), на пустках, засушаных і засоленых землях і балотах былі ўтвораныя земляробчыя камуны-кібуцы. Былі таксама закладзеныя новыя гарады, такія як Тэль-Авіў. Зямля пад іх адпаведна была законна, безь ніякага прымусу, купленая ў гаспадароў – арабаў і туркаў. Нават цяпер афіцыйная мера плошчы ў Ізраілі – арабскі дунам. Затым іміграцыя была паўстрыманая, асабліва пасьля арабскіх пагромаў 1929 году і паўстаньня канца 1930-х гадоў. Так званая Белая кніга (цыркуляр) брытанскага ўраду фактычна ўвяла забарону на ўезд гэбраяў у падмандатную Палестыну. Тым ня менш, на 1945 год прапорцыя арабскага і гэбрайскага насельніцтва была 2:1, калі арабы-мусульмане складалі каля 60% насельніцтва, а гэбраі 31%.

Ва ўмовах пашырэньня варожасьці між арабамі й гэбраямі брытанскія ўлады, што гублялі кантроль над сытуацыяй, вырашылі вывесьці свае войскі. Арганізацыя Аб'еднаных Нацыяў праз галасаваньне прыняла 29 лістапада 1947 году рэзалюцыю аб падзеле Палестыны на 2 дзяржавы – арабскую й гэбрайскую. За гэты падзел галасавала, між іншага, і дэлегацыя БССР у ААН. Затым увесну на землях, якія ААН прызначыла гэбраям, была праклямаваная незалежная дзяржава Ізраіль. Тут жа на наступны дзень, 15 траўня, супраць Ізраіля выступілі аб'еднаныя сілы 6 суседніх арабскіх краінаў, і ўнутры гэтай тэрыторыі дзеілі вайсковыя адзінкі палестынкіх арабаў. Як вядома, у выніку некалькіх месяцаў вайсковых дзеяньняў маладая краіна адстаяла сваю незалежнасьць, і ў 1949 годзе было падпісанае замірэньне паміж Ізраілем і арабскімі суседзямі. Лініі фронту, на якіх былі спыненыя баі, зрабіліся межамі дзяржавы Ізраіль.

Аднак на перададзенай арабам частцы Палестыны асобная арабская дзяржава не была створаная. Заходні бераг ракі Ярдан і Ўсходні Ерусалім далучыла да сябе Ярданія, а Сэктар Газа быў далучаны да Эгіпту. Шматлікія палестынскія ўцекачы, большасьць якіх падалася ўпрочкі па сваяму ўласнаму жаданьні,

*Заканчэньне на наступнай бачыне*

UstaukaCB1.qxd 8/29/2014 2:08 AM Page 1 (3,1)



# Міт аб “рускім народзе”

Для сучасных людзей скончыўся гэты міт банальна. Пасьля расейскай агрэсіі супраць Украіны і пасьля захопу Крыма нават сьляпыя, нарэшце, убачылі, што нешта тут ня тое з гэтым так званым “народам”. Усюды відаць натоўп агрэсіўных, злосных, лянівых, узбуджаных людзей. Яны ў эўрапейскай адзежы, але мэнтальна – на ўзроўні свайго мангольскага сярэднявечча. Глядзіш на іх, слухаеш, і здаецца, як бы і ні было эўрапейскай цывілізацыі, і дух Эўропы нават не зачапіў іхнага існаваньня.

І што цікава, расейцы, якія жывуць на Захадзе і глядзяць расейскае тэлебачаньне, – такія самыя. Увогуле, я заўважыў, што на Захадзе цывілізацыя на расейцаў ня дзейнічае. Уплывае на карэйцаў, японцаў, нават кітайцаў. А на расейцаў – не (“каким ты был, таким ты и остался”).

Расейская царская ідэалёгія, потым савецкая расейская прапаганда ўсяляк ляпілі гэты міт, ствараючы ў галовах людзей фантом арганізаванага сьвядомага народу, які быццам бы ёсьць сацыятворнай сілай грамадзтва, які па-брацку адносіцца да ўсіх народаў на грунце дружбы і ўзаемадапамогі. Прапаганда трубіла пра гэта на кожным кроку, усюды і для ўсіх, пачынаючы са школьнай парты. Масы абыватэляў прымалі словаблудзтва за чыстую манету, нягледзячы на ўражлівую неадпаведнасьць рэальнасьці, дзе не было ніякай павагі да чалавека, і ніякай павагі да іншых народаў, і ніякай сацыятворчасьці з боку расейскіх, акрамя дзяржаўнага тэрору ды ўціску, дзяржаўнага зладзейства ды хлусьні, п’янства ды крыміналу, ды гультайства, ды безадказных адносінаў да працы. Існаваў відавочны расейскі падвойны стандарт і фальшывыя дачыненьні.

І вось уся гэтая прапагандысцкая бурбалка пра “рускі народ” у чарговы раз лопнула. Д’ябал выскачыў са скуры. Усе зноў убачылі (як раней у бальшавіках) дзікі ашчэр шалёнага натоўпу са шклянымі вачыма і перакошаным нянавісьцю абліччам. Гэта нянавісьць да ўсяго сьвету, якую стагодзьдзямі, пачынаючы ад мангольскага існаваньня, вырошчвала ў натоўпе маскоўская ўлада і пазьней расейская імпэрская літаратура, школа і расейскае паліцэйскае (гэбоўскае) праваслаўе.

Высновы, якія я тут падкрэсьліваю, даўно вядомыя ў беларускай інтэлектуальнай думцы і ў нацыянальнай палітыцы. Мне прыходзілася пра гэта падрабязна пісаць яшчэ ў пачатку семідзесятых у беларускім “Самвыдаце” (Гэнрых Ракутовіч).

Калі тэзісна (з таго, што дасьледвана), то адзначу наступнае палажэньне. Не існуе ў прыродзе “руская нацыя” (ці, як расейцы гэта называюць, “рускі народ”). Грамадзкае дэмаграфічнае ўтварэньне, якое ёсьць у Расеі і якое карыстаецца расейскай мовай, зьяўляецца не нацыянальным, а імпэрскім утварэньнем. Імпэрыя як грамадзкі мэнтальны фэнамэн і пераходная агульнасьць людзей (пераходная да нацыі), выступала ў гісторыі даўно і зьвязана з цэнтралізаванай імпэрскай сыстэмай улады і імпэрскай дзяржавы, пагрунтаванай на адзінай ідэалёгіі і на шматлікіх этнасах, народах і этнічных групах насельніцтва.

Імпэрыі, як правіла, распадаюцца ў выніку ўнутранай барацьбы народаў і зьбегу ўнутраных і зьнешніх абставінаў. У працэсе змаганьня і распаду адбываецца сутыкненьне паміж імпэрскай ідэалёгіяй, з аднаго боку, і этнічнай ці нацыянальнай – з другога. Працэс распаду і паўраспаду імпэрыяў у новай Эўропе заняў больш за дзьвесьце гадоў (Атаманская імпэрыя, Аўстрыйская, Пруская, Расейская, Брытанская, Югаслаўская), спарадзіў дзьве сусьветныя вайны і шмат лякальных і каляніяльных крывавых войнаў, якія характарызаваліся злачынствамі супраць чалавецтва. Доўга і пакутліва распадалася старажытная Рымская імпэрыя, якая пакінула пасьля сябе ўзоры імпэрскай культуры, але не захавала нават імпэрскага этнаса і імпэрскай мовы (лаціна засталася мёртвай мовай без этнічнага носьбіта, які быў раздушаны і праглынуты імпэрыяй). Тыя ж самыя працэсы распаду (страта імпэрскай мовы), характэрныя для Атаманскай імпэрыі, і ў будучыні пагражаюць Расейскай (расейская мова стане мёртвай мовай), якая вось ужо сто гадоў перажывае працэс імпэрскага паўраспаду.

Распад Расеі непазьбежны з прычыны якраз існаваньня агрэсыўнай імпэрскай расейскай мэнтальнасьці і глыбокай дэградацыі расейскага этнасу. Сёньняшні стан расейскай імпэрскай субагульнасьці паказвае, што распад можа быць крывавым, зь верагодным уплывам на Эўропу і ўвесь сьвет.

І яшчэ некалькі слоў аб імпэрскай агульнасьці, што да характарыстыкі яе сутнасьці. Імпэрыя (як сацыяльна-дзяржаўная і мэнтальная агульнасьць людзей) па прыродзе сваёй (у адрозьненьне ад нацыі) настроена не на ўнутранае, а на зьнешняе, экстэнсіўнае разьвіцьцё, не на аддзяленьне і суверэнітэт культуры, а на паглынаньне іншароднага не на самаарганізацыю, а на пашырэньне. У выніку такой арыентацыі імпэрыя задушвае ўнутраныя культурныя сілы, традыцыі, этнасы і народы, у тым ліку і свой уласны. Вынік такога існаваньня імпэрскага грамадзтва залежыць ад таго, на якім этапе пачынаецца распад. Чым раней, тым лепш.

Я пераказаў некаторыя ўжо напісаныя мной раней палажэньні аб Расеі і аб імпэрскай супольнасьці, улічваючы цяперашнюю сытуацыю і магчымасьць зразуменьня праблемы па-за межамі прапаганды. Гэта істотна, бо падзеі, якія пачаліся ў нас ва Ўсходняй Эўропе ў сувязі з расейскай агрэсіяй супраць Украіны вельмі важна адэкватна і адпаведна ацэньваць і разумець.

Нядаўна я прачытаў інтэрв’ю Юры Хашчавацкага. Пытаньне:

– Як Пуціну ўдалося за такі кароткі тэрмін “правесьці Лабатамію” ўсёй краіны, пазбавіць здольнасьці думаць такую вялізную колькасьць людзей?

– Жахліва! Калі ў свой час Зянон Пазьняк казаў, што Беларусь – гэта мадэль, выпрабавальны палігон для Расеі, я сьмяяўся, думаў, што ён вар’ят. Але Зянон меў рацыю.

Гэтую цытату з інтэрвію я прадэманстраваў як прыклад значэньня тымчасовасьці ў палітыцы. Праца “Палігон” была напісана мной і агучана ў Вашынгтоне ў 1997 годзе. Тады сама ішла прапаганда пра так званую “дэмакратычную Расею” і іншыя прыдумкі, якія падтрымлівала Амэрыка. Грамадзтва, не зьвязанае з нацыянальнай палітыкай, жыло пад уплывам тагачаснай тэлевізійнай наркаты і нямецка-расейскай дэмагогіі пра “дэмакратыю” ў Расеі. Звычайныя беларускія людзі, інтэлектуалы, грамадзтва не маглі тады адэкватна ўспрыняць рэчаіснасьць, бо ня ўлучаныя былі ў нацыянальную палітыку, а тэлекарцінка была іншай, чым рэальнасьць (трэба ведаць псыхалягічны парадокс – людзі вераць тэлебачаньню, а не рэальнасьці).

Цяпер расейская тэлекарцінка зьмянілася. Абплёўваюць украінцаў. Дэманструюць пад лёзунгам “Нам не надо свабоды” і абзываюць дэмакратыю “фашызмам”. Шавіністычны чад і абсурд зашкальвае. І вось тут у людзей ёсьць магчымасьць параўнаць з рэальным жыцьцём карцінкі, якія зьмяняліся, і “карцінкі з карцінкамі”. Цяпер расейская рэальнасьць ужо вылазіць на экран з расейскім крыкам, рыкам, матам і скрыўленым ад нянавісьці ротам. Цяпер людзям можна глядзець і шмат што ўбачыць. Толькі нельга зноў памыліцца.

Расейскія – гэта не народ, спадарства, гэта ашалелы, бяздумны імпэрскі натоўп, лахманы духа, пачынаючы ад бамжа і зэка і канчаючы акадэмікам і дзеячом мастацтва (500 расейскіх дзеячоў імпэрскага мастацтва і культуры – амаль уся культурная верхавіна імпэрыі – падтрымалі пуцінскую агрэсію супраць Укра-

***Заканчэньне на наступнай бачыне***

UstaukaCB1.qxd 8/29/2014 2:08 AM Page 3 (1,1)



іны і бруднае зьневажэньне ўкраінскага народу). 87% ухваляюць варварскую палітыку Пуціна і ганарацца агрэсіяй. Гэтае грамадзтва ня ёсьць нацыяй. Гэта люмпэнская імпэрская супольнасьць раскрываецца цяпер перад сваім канцом. Гэта "талібы", якім хочацца ўсё крушыць. Тут на іх ня дзейнічае ні лёгіка, ні крытэрыі культуры, ні здаровы сэнс. Санкцыі іх толькі мацней узлуюць і згуртуюць у нянавісьці. Яны думаюць ірацыянальнальна, кіруюцца іншымі катэгорыямі ўспрыняцьця. У іх крымінальная шкала каштоўнасьцяў.

Мне ўспамінаецца выпадак за часы Гарбачова, апісаны адным з расейцаў. Будучы недзе на поўдні СССР, Гарбачоў са сьвітай выйшаў "у народ", убачыў пакамечанага тыпа ў ватніку і кажа: "Ну, вот, давайте у народа и спросим. Ну, вот, как вы относитесь к перестройке, что надо нам сделать?" А той падумаў і, заплятаючыся языком, кажа: "Я думаю, прежде всего, нам надо забрать Дарданеллы". У гэтым, як кажуць, уся Расея.

Павінен сказаць, што ў расейскім грамадзтве заўсёды знаходзіліся адзіночкі, якія крытычна ўспрымалі расейскую рэчаіснасьць і разумелі імпэрскую сьвядомасьць расейскага натоўпу. Нядаўна адзін такі расейскі грамадзянін былы дэпутат Думы Канстанцін Баравой выказаўся, што за ўсё тое, што зараз робіць Расея супраць Украіны, вінаваты і нясе адказнасьць, перш за ўсё, так званы "расейскі народ" – сацыяльна зьдзічэлы натоўп, які спарадзіў Пуціна. Ніякіх паразуменьняў расейскіх з украінцамі пасьля ўсяго, што ўжо натварылі расейцы ва Ўкраіне, ня будзе і быць ня можа (лічыць Баравой). Расейскі натоўп, на думку Баравога, мусіць толькі каяцца і прасіць прабачэньня ва ўкраінцаў за пакаленьні наперад. "На колени, твари!" – усклікае былы дэпутат расейскай дзяржаўнай Думы.

Мы, беларусы, у большасьці разумеем паталёгію нашага вечнага ворага. Але астатні сьвет – сумняваюся. І ў гэтым якраз ёсьць вялікая небясьпека. Сьвет кажа расейцам пра дэмакратыю ды законы, а Расея – пра "бэндэраўцаў" і Дарданэлы.

Мушу паўтарыць тое, што кажу ўвесь час. Толькі жорсткая салідарная пазыцыя сьвету і сіла можа спыніць маскоўскую арду. Усё астатняе (дыпляматыя, бяззубыя санкцыі) – гэта ілюзіі, якія могуць дорага каштаваць народам і людзям.

Мы, беларусы, павінны казаць і думаць пра мір, але рыхтавацца да вайны, якая залежыць не ад нас. У самым факце нашага беларускага супрацiўленьня акупантам будзе закладзена магчымасьць перамогі і вольнай будучыні. Пра гэта я ўжо пісаў і паўтараю зноў і ўвесь час: патрэбна зброя, збор інфармацыі, структурызацыя плюс асьветніцкая і агітацыйная прапаганда за вольную Беларусь, плюс салідарнасьць з Украінай. Трэба рыхтавацца да барацьбы за Айчыну і свабоду.

**Зянон ПАЗЬНЯК**

*17 жніўня 2014 г.*

# Змагаймася за будучыню і Беларусь!

Наша свабода будзе залежыць ад нашага супраціўленьня агрэсарам. Верагоднасьць захопу і расейскай агрэсіі вялікая, і да вайны трэба быць гатовымі, рыхтавацца ўжо цяпер тым, хто здольны гэта разумець і каму дарагая Бацькаўшчына і свабода.

На жаль, поўная непадрыхтаванасьць Украіны да вайны з расейскім фашызмам і жыцьцё ў палоне "брацкіх" ілюзіяў дорага ім каштавала. Нам трэба дапамагаць Украіне ў іхняй барацьбе. У нас агульная справа і агульны вораг.

Наш голас да беларусаў пра падрыхтоўку і салідарнасьць з Украінай пачуты, нягледзячы на шаленства расейскай дэзінфармацыі і хлусьні. Беларусы ўжо ваююць разам з украінцамі за свабоду Ўкраіны супраць пуцінскай агрэсіі. Падрабязнасьцяў мы не даем, але за беларусаў ганарымся. Асабліва ўлічваючы безразьдзельнае панаваньне расейскай гёбэльсаўшчыны ў інфармацыйнай прасторы Беларусі і яе атрутны ўплыў на сьвядомасьць людзей.

Нашыя звароты да беларусаў аб падрыхтоўцы да адпору лубянская агентура, вядома ж, заўважыла і адрэагавала ў Сеціве на шэрагу рэсурсаў прытым даволі стрымана і асьцярожна, бадай, акрамя аднаго рэсурса – воргана ТБМ "Новы час", дзе інфармацыя пададзена ў старых правінцыйных традыцыях стылю камуна-савецкай агентуры, падлаваценька, з падтэксьцікам і прыхаваным абсьмейваньнем. Але гэта глупства – галоўнае ў канцы. А ў канцы – характэрная рэжымная пагроза. Цытата: "заклік Пазьняка і сьледаваньне яму можа быць падставай для крымінальнага перасьледу па шмат якіх артыкулах айчыннага Крымінальнага кодэкса."

Матэрыял не падпісаны, значыць – рэдакцыйны. І хто ж гэта беларусаў палохае "айчынным" лукашысцкім кодэксам? Спускаемся ўніз... Ба! Знаёмыя асобы! Галоўны рэдактар – Аляксей Кароль. Нават адзначыўся. Прыгразіў беларусам, маўляў, глядзіце, супраць Масквы – ні-ні! (Ну, але гэта мы так, дзеля сьмеху працыталі, бо і злое, і камічнае ходзяць побач.)

Гісторыя са зьбіцьцём расейскімі бандытамі малазійскага пасажырскага самалёта над Данбасам 17 ліпеня гэтага году сьведчыць ізноў, што Крэмль плянуе для Ўкраіны доўгую крывавую вайну пад фальшывай лічынай "міратворца". Схему крамлёўскіх паводзінаў тут апісваць я ня стаў бы. Разьвіцьцё падзей будзе залежыць ад цьвёрдасьці Парашэнкі, якога Эўропа, зразумела, пачне схіляць да замірэньня і перамоваў з расейскімі бандытамі. Але выглядае, што ў выпадку правалу палітыкі фальшывага "міратворства" Масква можа пачаць татальнае ваеннае ўварваньне і "навядзеньня рускага парадку" ва Ўкраіне ў "інтарэсах усяго сьвету" пад крымінальны лямант "трымай злодзея!" Да гэтага Масква рыхтуецца.

У пуціністаў ёсьць вялікі вопыт пад Смаленскам (2010 г.), калі "заклапочаная" заходняя Эўропа (схавана радуючыся) спусьціла ў пясок пуцінскую расправу з польскім урадавым самалётам, зь нелюбімым у Эўропе прэзыдэнтам Качынскім на борце. Расейская гёбельсаўшчына цяпер сябе таксама пакажа.

Тым больш нам, беларусам, трэба цяпер думаць пра сваю Беларусь. Пасьля расейскага нападу на Ўкраіну становішча рэзка і кардынальна зьмянілася, дзейнічаюць іншыя заканамернасьці і іншая лёгіка дачыненьняў. Гэта лёгіка ваеннага часу, якая вымагае хуткіх, рашучых і адэкватных паводзінаў. Ня трэба ніякіх заклінаньняў, бо тут ужо іншая мова і іншая справядлівасьць. Прамаўляюць прагматычны інтэрас, маніякальнасьць, зброя і збройная сіла. (Ня трэба забывацца, што з нападам Расеі на Ўкраіну лукашысцкі рэжым аўтаматычна апынуўся на баку Расеі, а значыць – на баку вайны. Балбатня Лукашэнкі тут ня мае значэньня.)

Беларусь за 20 гадоў унутранай акупацыі і антыбеларускай палітыкі рэжыму фармальна ўжо падрыхтавалі да анэксіі. На чарзе цяпер важны для Масквы этап – інфармацыйная апрацоўка дэнацыяналізаванага беларускага насельніцтва, якую якраз расейцы пачалі праводзіць праз абплёўваньне Ўкраіны ва ўсіх сваіх сродках масавай інфармацыі.

Гістарычная практыка паказвае, штоператварыць любую нацыю на пэўны час у натоўп сацыяльных ідыётаў зь неадэкватным успрыняцьцем рэчаіснасьці праз дастасаваньне гёбельсаўскай інфармацыйнай палітыкі – для выканаўцаў яе ёсьць справа нескладаная і дасягальная. Тым больш, што супраць такога злачынства да гэтага часу не існуе ніякага нацыянальнага і міжнароднага заканадаўства. Пасьля татальнай апрацоўкі інфармацыйнай хлусьнёй вынікі замбаваньня насельніцтва выка-

UstaukaCB1.qxd 8/29/2014 2:08 AM Page 3 (3,1)



рыстоўваць будзе ўжо чужая акупацыйная збройная сіла, якая ўрываецца ў краіну і (як правіла) перамагае без супраціву.

Аднак пры аказаньні супраціву (асабліва патрыятычнага супраціву), вынікі інфармацыйнага замбаваньня натоўпу могуць рассыпацца ўшчэнт, зьехаць на нуль, і вельмі хутка. Натоўп зьнікае перад альтэрнатывай, абапертай на сілу.

Вось на гэтым і палягае абавязковая арганізацыя супраціўленьня агрэсіі і варожаму наступу. **Толькі змагаючыся, можна перамагчы.** Маскоўскі вораг не павінен застаць беларусаў непадрыхтаванымі, з голымі рукамі і бяздумнымі галовамі. Вораг рыхтуецца. Яго агрэсія тут толькі пытаньне часу, моманту і абставінаў.

Найцяжэй, вядома, людзям пачаць цяпер думаць на ўмовах пагрозы вайны і ваенннага часу. Але ранейшы час скончыўся. Новы час вымагае іншых дзеяньняў. Гэтыя дзеяньні напачатку такія: ваенная салідарнасьць з Украінай і ўдзел беларускіх дабраахвотнікаў у баях з акупантамі. У Беларусі: структураваньне па два-тры чалавекі, назапашваньне зброі, выбухоўкі, амуніцыі, ваеннай інфармацыі. Ніякіх дзеяньняў заўчаснага супраціву. Ніякіх павелічэньняў груп. Аўтаномны рэжым. Ніякіх пошукаў кантактаў паміж групамі. Усё гэта можа стацца пазьней.

Трэба ўсьведамляць яшчэ наступнае. Лукашысцкі рэжым не пакінуў абсалютна ніякіх законных і легальных магчымасьцяў зьмены ўлады. Нацыя загнаная ў кут. Беларусы гэта ўжо разумеюць і перасталі хадзіць на рэжымныя выбары, якіх рэальна не існуе. У такім стане ёсьць тры варыянты існаваньня і перамен. Першы (самы любімы для запалоханага насельніцтва) – нічога не рабіць, скуголіць і хваліць узурпатара. Другі – фізічная ліквідацыя сатрапа. І трэці – рэвалюцыя. Зразумела, што законным і эфэктоўным можа стаць толькі трэці варыянт.

Але ёсьць вышэйшая гістарычная заканамернасьць, пацьверджаная практыкай. Вызваліцца з-пад імпэрскай акупацыі і залежнасьці можна толькі тады, калі нацыянальная рэвалюцыя супадае з агульнай барацьбой супраць імпэрыі і ў выніку – з распадам імпэрскай сыстэмы (1917 год і 1991 год – вымоўныя прыклады). Цяпер якраз настае такі пераменны час, які нам, беларусам ні завошта нельга страціць.

Лубяншчына ўжо замітусілася ў сваіх камэнтарах пра беларускія ініцыятывы супраціўленьня. Выцягнулі на паверхню сваю заляжалую канторскую граззь (усялякія “нісэпі”) і гэтак, нібыта “зь веданьнем справы”, вяшчаюць. Вы толькі паслухайце гэтых мудрацоў: “Распространяемые в Минске листовки с призывами вооружаться и быть готовыми к “отражению российской агрессии” не найдут массового отклика у белорусов, заявили эксперты.” (“Народная Воля”). А чаму “ня знойдуць”? Бо як сьведчыць іхны “нісэпі” большая палова беларусаў верыць расейскаму “гёбэлс-тэлебачанньню” і падтрымлівае Расею. “С учетом этих настроений призывать белорусов готовиться к военному противостоянию с российской стороной бессмысленно,” – вяшчае іншы “спэц”.

Выказваньні вымоўныя, тыповыя для непрыяцелеў Беларусі. Яны разумеюць, што наш зварот не накіраваны на “масавы водгук” (як яны пішуць), але выкарыстоўваюць яго як нагоду, каб сказаць сваё лубянскае, што “противостояние с российской стороной бессмысленно”.

Аднак працытаваў я тут гэтую філісьцерскую канторскую “мудрасьць” яшчэ з іншай нагоды. Гэтакая пазыцыя – праява тыповай рабскай псыхалёгіі (адмаўленьне ад змаганьня з-за непераадольных перашкод). І гэтае рабскае думаньне пад выглядам здаровага сэнсу невыпадкова навязваецца грамадзтву, каб пазбавіць людзей волі да барацьбы. У змагарнай палітыцы такога падыходу не існуе (інакш гэта было б не змаганьне, а прафанацыя). Тут так: Ёсьць мэта барацьбы. Пагаджаемся, што яна мусіць быць дасягнута. Усё. Пачынаем змагацца. Урэшце перамагаем. Вызначальным ёсьць рашэньне аб змаганьні, а не акалічнасьці.

У 1988 быў магутны Савецкі Саюз, маналітная КПСС з КГБ, сьветазарны сатанінскі культ Леніна, стоадсоткавы савок, шматмільённая акупацыйная армія, ніякой свабоды, крызіс сыстэмы. Наша беларуская мэта была такая: адраджэньне нацыі, свабода, незалежная Беларусь без камуністаў, дэмакратыя, гроб для СССР. Пагаджаемся. Ствараем Народны Фронт. Пачынаем змагацца пад лямант і масавы хор: адшчапенцы, маргіналы, фашысты, нацысты, агенты ЦРУ, “народ протів”, “оторвалісь от реалій” і г. д. Праз тры гады – перамога. І гэта магутны гістарычны факт.

Пераможная палітыка – гэта мастацтва немагчымага. Памятайма словы перамоганоснага Давыда Гарадзенскага перад выправай на магутнага ворага: “Нас мала – літасьці не чакайце.”

Вось ў гэтым (у пасьлядоўнай дарозе да мэты) сутнасьць палітычнага змаганьня. Яно можа стаць пераможным праз год, праз тры гады, праз трыццаць гадоў, праз трыста гадоў! Але настане, будзе пакуль змагаемся. Моц, колькасьць і сіла праціўніка, які пагражае нам нацыянальнай сьмерцю, не можа ўплываць на рашэньне аб барацьбе зь ім. Пытаньне толькі адно: змагаемся ці не змагаемся? Расейская фашысцкая прапаганда імкнецца паралізаваць у народаў волю да супраціўленьня, прышчапіць людзям думаньне і псыхалёгію раба. Наш зварот да вольных людзей, бо вольным патрэбная воля, і яны вызначаюць будучыню нацыі. Нявольнікі могуць выклікаць толькі яе няволю.

Беларусь будзе вольнай вялікай і магутнай краінай, родным, домам для ўсіх яе сыноў і дачок, а вольныя людзі ёсьць, і колькасьць іх будзе павялічвацца ў барацьбе з Масквой.

Фашысцкая імпэрская Расея мусіць сканаць, разваліцца на часткі. На абломках гэтай пачвары будуць вольныя краіны, якія пабудуюць свае вольныя незалежныя дзяржавы.

***Зянон ПАЗЬНЯК***

*24 ліпеня 2014 г.*

# Гістарычнае няшчасьце і дарога наперад

Апошнім часам пайшла паласа лукашысцкіх “юбілееў”: то 20-гадовая дата першага туру выбараў у 1994 годзе, то 20 год другога туру, то юбілей, калі сатрап, насуперак Закону, уламаўся ў кабінэт былой Камісіі Вярхоўнага Савету, і яму міліцыянэры спэцкалі касьцюм, то юбілей нейкай пачварнай фразы, якую сатрап зброхаў 20 гадоў таму, то 20-гадовы юбілей яго прысягі і г. д.

Пра ўсё гэта ня ведалі б і ня ўспомнілі б, калі б ні так званыя “дэмСМІ”, якія на ўсе лады асьвятляюць гэтыя 20-гадовыя “юбілеі” ды ўзахлёб распавядаюць яшчэ і пра дэталі. Здаецца, што для гэтай дэмжурпублікі насарогі канчаткова сталі добра пахнуць. Ім і ў галаву не прыходзіць, што не бывае 20-гадовай улады прэзыдэнта, як і не бывае вечных прэзыдэнтаў. Тады гэта ўжо не прэзыдэнты. А тут яшчэ і розныя 20-гадовыя “юбілеі” гэтага здрадніка нацыі дэманструюць.

Гэта сапраўды няшчасьце, што мы ў цяжкі час фактычна ня маем дэмакратычных беларускіх сродкаў масавай інфармацыі. Чытаем згоднікаў і канфармістаў. Эрозія інтэлекту і разбэшчаньне грамадзтва расейскай агентурай у нас на парадак горш, чым ва Украіне. Складваецца ўражаньне, што ніхто нічога ня ведае пра тое, што адбывалася ўсяго 20 гадоў таму, ня памятае, не арыентуецца, не разумее, дзе жыве, у якім грамадзтве і краіне.

Нядаўна я праслухаў у этэры гутарку за круглым сталом у Празе якраз на тэму юбілеяў нягодніка і вырадка, які пры дапамозе Масквы зглуміў беларускую нацыю, спляжыў беларускую школу,

***Заканчэньне на наступнай бачыне***

UstaukaCB1.qxd 8/29/2014 2:08 AM Page 1 (1,1)



навуку, мову, культуру, абпляваў лепшых людзей Беларусі, пазабіваў палітыкаў, здушыў моладзь, здаў нацыянальную маёмасьць ворагам, упусьціў расейскую ваеншчыну ў Беларусь. Пра гэта, вядома, ні слова ў “юбілейнай” тэме. Расказвалі беларусам, як праходзілі выбары ў 1994 годзе, ды што несьлі з сабой у галаве ды за душою кандыдаты на прэзыдэнта, і што б было, калі б прэзыдэнтам стаў іншы. Але Лукашэнка, маўляў, вырваўся наперад і нечакана ўсіх перамог. Нават Шушкевіч там у іх фігуруе як нейкая самастойная асоба. Той самы Шушкевіч, які год таму, калі рыхтавалася пуцінская апэрацыя па захопу Беларусі, выступіў публічна з заявай, каб увялі ў Беларусь расейскія войскі. Кіеўскі Майдан нечакана зблытаў Пуціну карты, і пуціністы пачалі захоп з Украіны. (Словаблудзтва Шушкевіча павісла ў паветры.)

У 1994 годзе не было аморфнай сытуацыі, дзе шэсьць кандыдатаў нібыта ішлі самастойна шасьцю калёнамі, як гэта хоча прадставіць расейская лубянская агентура, і як словаахотліва паўтараюць цяперашнія “дэмсмі”. У 1994 годзе быў жорсткі падзел і барацьба не на жыцьцё, а на сьмерць паміж дзьвума сіламі: з аднаго боку Беларускі Народны Фронт і ягоны кандыдат, з другога боку — Масква, Лубянка і ўся камуна-савецкая намэнклятура ў Беларусі. Яны ведалі, што перамога БНФ будзе абазначаць канец маскоўскай уладзе ў Беларусі. Яны разумелі, што будзе рэалізаваны Балта-Чарнаморскі Энэргетычны Калектар (праектныя распрацоўкі калектара па ініцыятыве БНФ тады якраз пачаліся). Яны адчувалі і непакоіліся разам зь немцамі, што калі прэзыдэнтам у Беларусі стане кандыдат БНФ, то (зыходзячы з палітычнай канцэпцыі Фронта) рэальна можа ўтварыцца трэцяя геапалітычная сіла ў Эўропе (так і было б), якая злучыла б Беларусь, Украіну, Малдову, Прыбалтыку і Польшчу. А гэта — 110-115 мільёнаў насельніцтва, агульны рынак, усе рэсурсы, тэхналёгіі і разьвязка ўсіх гандлёвых шляхоў плюс супольная гісторыя і ідэёва блізкая культура. Тым часам і Турцыя, і Грузія таксама і, магчыма, нават Фінляндыя далучыліся б да нас, а не да Эўразьвязу, і Амэрыка падтрымала б (і мы ведаем, чаму).

Новая Ўсходняя Эўропа (Балта-Чарнаморская супольнасьць) — гэта была б сьвежая сіла, якая стымулявала б Адраджэньне ўсёй Эўропы — Эўропы дэмакратычных айчынаў без нямецкага і расейскага фашызму, без заходняга лібэралізму і ягонага антычалавечага, антымаральнага паскудзтва.

Новая Ўсходняя Эўропа абазначала б канец імпэрыялізму фашысцкай Расеі. Нам, фронтаўцам, ад пачатку было зразумела тое, што цяпер мусілі б усьвядоміць усе беларусы і ўкраінцы, і Каўказ. Ніколі ня будзе нам ні міру, ні свабоды, ні вольнага жыцьця, пакуль існуе ў любой форме ўлады такая імпэрская краіна, як Расея. Фашысцкая Расея павінна быць разбурана, як быў разбураны Трэці Райх. Такой імпэрыі не павінна існаваць. Гэтая арда вось ужо хутка 800 гадоў ёсьць пастаянны падпальшчык вайны, пагроза чалавецтву і язва на целе народаў. Расейскі імпэрыялізм, і тым больш расейскі цяперашні фашызм, павінны быць зьнішчаны гэтак жа, як пасьля 1946 году і Нюрнбэрга быў зьнішчаны нямецкі мілітарызм. Толькі тады настане спакой і мір у Эўропе.

Удакладняю, размова ідзе аб ліквідацыі агрэсіўнай імпэрыялістычнай дзяржаўнай сыстэмы, небясьпечнай для чалавецтва, а не аб рэпрэсіях насельніцтва. Народы Расеі мусілі б атрымаць нацыянальную свабоду на сваёй тэрыторыі (у тым ліку і расейскія на сваёй тэрыторыі).

У 1994 годзе сілы Масквы супраць БНФ на выбарах ў Беларусі прадстаўлялі два кандыдаты — Кебіч і Лукашэнка, якія пікіраваліся паміж сабой, але дзейнічалі сумесна супраць БНФ. (Афіцэр ГэБэ Кебіч пазьней гэта нават афіцыйна пацьвердзіў). Астатнія кандыдаты (Новікаў, Дубко, Шушкевіч) электаральна спрыялі Кебічу і Лукашэнку ў палітычным падзеле. Шушкевіча, напрыклад, увялі ў кампанію даволі позна па прапанове М. Статкевіча і пры падтрымцы А. Трусава, выкарыстаўшы сацыял-дэмакратаў. Задача яго была элемэнтарная: адрываць галасы ад кандыдата БНФ.

У гэтай барацьбе супраць БНФ дапамагалі таксама немцы (друкавалі агітпрадукцыю для Лукашэнкі). Тым ня менш Масква трывожылася. На Гарадзеншчыне (ведаю зь першых рук) спэцыяльна драматызавалі становішча па формуле “альбо-альбо”. У сэнсе, што “калі прыйдзе Пазьняк, — усім канец”. Казалі, што трэба легчы касьцьмі, але не дапусьціць яго да прэзыдэнцтва. Выбары трактавалі як выбар лёсу, а маёй маці былыя намэнклятурныя камуністы намякалі, што мяне чакае сьмерць.

І гэта праўда. Такая задумка ў іх была. Але ім усё ж пашанцавала, бо ў выпадку перамогі Фронта стрэліць бы яны не пасьпелі. Прышлося б трымаць адказ за свае антынародныя дзеяньні ўлучна з злачынствам Чарнобыля. Бюракратычнай валтузьні не было б. БНФ рэальна вярнуў бы людзям іхныя разрабаваныя намэнклятурай ашчадныя зьберажэньні, даў бы рэальную свабоду ў працы, дзейнасьці і перамяшчэньні. Беларусам вярнулі б зямлю. Усё было б добра і разумна, як і павінна было быць у беларусаў.

А была б народная ўлада ў Беларусі, то і ў Расеі сталася б інакш, і ва Украіне, і не захапіў бы КГБ уладу ў Маскве, і шмат яшчэ — ня стану пералічваць.

У 1994 годзе плян Масквы ўдаўся. Была задзейнічана тыповая бальшавіцка-гэбоўская тэхналёгія: стаўка на прапаганду хлусьні, на палітычна неадукаваных людзей, на нізкія плясты грамадзтва і, адпаведна, — на самыя прымітыўныя матэрыяльныя інтарэсы і самыя мінімальныя матэрыяльныя запатрабаваньні, вырашчаныя ў падсавецкай рэчаіснасьці. Эканамічны крызіс, створаны ў Беларусі Масквой, апора на КГБ, на савецкую намэнклятуру і на татальнага саўка забясьпечыла Крамлю рэалізацыю пляна і — фактычную ўладу над Беларусьсю. На саўку, на КГБ і на Маскве трымаецца і рэжым Лукашэнкі.

Адэкватна адлюстраваць той заломны час 1994 года можна толькі зыходзячы з нацыянальных інтарэсаў, бо тады вырашаліся лёс і будучыня беларускай нацыі, якой імкнуліся распарадзіцца антыбеларускія групы ў маскоўскую карысьць. Ім у каторы раз тое ўдалося, выкарыстаўшы сыстэму антынароднай улады і апэлюючы да грамадзкай цемры і палітычнай нясьпеласьці насельніцтва. Але сутнасьць лёсавызначальных падзей (па азначэньні) ня могуць перадаць ворагі нацыі. Карціна, напісаная імі, у прынцыпе ня можа быць адэкватнай. Рэальную гісторыю беларускай барацьбы здольныя адлюстраваць беларусы, якія змагаліся з гэтымі ворагамі сьвятла і народа, яго мовы і будучыні. На сёньняшні дзень я бачу толькі працы Сяргея Навумчыка, у якіх з палітычным разуменьнем і веданьнем апісаны той час.

20 гадоў унутранай акупацыі і расейска-лукашысцкага маразму ў Беларусі адбіліся крайне разбуральна на жыцьці нацыі. Галоўная шкода заключаецца ў стварэньні сыстэмы дэфармацыі і рэпрадукаваньня мэнтальнага і сацыяльнага тыпу саўка, які стаўся дамінуючай групай грамадзтва. У сацыяльна-культурным сэнсе гэта дэградацыя і разбурэньне грамадзкай пэрспэктывы. Савок цяперашні — гэта ўжо ня толькі адсталыя плясты грамадзтва. Рэпрадукаваны савок стаў вялікім, ён насяляе ўжо рэжымныя і дэмакратычныя СМІ, уладу, маладзёвыя структуры, гандаль, сродкі інфармацыі, якія славаблудзяць аб “юбілеях” і датах дыктатуры і г. д.

Нагадаю нашае традыцыйнае фронтаўскае правіла аб неабходнасьці стварэньня новага чалавека, новага думаньня ў барацьбе з акупацыйнай дыктатурай, саўковай коснасьцю, абыякавасьцю і здрадай. Тады, у 1994-м, гэтых новых людзей было яшчэ недастаткова. Занадта мала часу адпусьціла беларусам гісторыя. Але і цяпер, нягледзячы на маразматычную саўковасьць навокал, шлях да свабоды застаецца той жа — праз новага вольнага беларуса, які шануе свой гонар, Бацькаўшчыну, мову і народ і гатовы змагацца за нашу дзяржаву, культуру і волю.

**Зянон ПАЗЬНЯК**

*1 ліпеня 2014 г.*

расьсяліліся ў навакольных арабскіх краінах. За выняткам Суэцкага крызісу ў 1956 годзе, амаль 20 год пасьля перамогі ў вайне за незалежнасьць прайшлі больш-менш бясьпечна. У Ізраілі засталася жыць значная колькасьць арабаў, што атрымалі ўсе належныя канстытуцыйныя правы. Аднак у сярэдзіне 1967 году арабскія краіны, што атрымалі паразу ў 1948-1949 гг., вырашылі ўзяць рэванш і нанесьці супольны ўдар па Ізраілі. Даведаўшыся пра пляны суседзяў, Ізраіль нанёс папераджальны ўдар, і вынікі яго былі яшчэ больш ашаламляльныя, чым папярэдняя перамога. За 6 дзён вайсковых дзеяньняў Ізраіль разьбіў арабскія арміі й захапіў тэрыторыі ад Галанскіх вышыняў на паўночным усходзе да Суэцкага каналу на паўднёвым захадзе. Так пачалася гэтак званая "акупацыя". У гэты час набіраў сілы палестынскі рух змаганьня за незалежнасьць, які абраў для сябе тэрарыстчныя мэтады – захопы самалётаў, выкраданьне людзей, напады на мірных жыхароў Ізраілю.

Ад той пары палестынскія нацыянальныя сілы трымаюцца стратэгіі непрызнаньня Ізраілю й ухіленьня ад перамоваў, тактыкі ўжываньня свайго мірнага насельніцтва як жывога шчыта пры ўзброеных канфліктах, і тактыкі тэрарызаваньня ўсяго без разбору насельніцтва Ізраілю для дасягненьня сваіх палітычных і вайсковых мэтаў.

Скрайнім прыкладам такой палітыкі зрабілася кіраваньне ісламісцкага руху Хамас у Сэктары Газа, пад патранатам і дапамогай тэакратычнага рэжыму ў Іране. Ужо пачынаючы з канца 1970-х гадоў у Газе ішла ісламізацыя публічнай прасторы – перш змусілі апрануць паранджу-гіджаб усіх жанчынаў, пераважна адукаваных і заможных, што не насілі яе. Гэтая тэндэнцыя ўзмацнялася і пашыралася. З прыходам Хамасу да ўлады ў 2007 годзе стан справаў зьмяніўся да яшчэ больш гвалтоўнага накіданьня шарыяту. Людзі сталі скардзіцца на меры, якія нагадвалі гвалт рэжыму Талібану ў Аўганістане. Дзеля ўзмацненьня кантролю над насельніцтвам Хамас забараніў мужчынам і жанчынам, што не зьяўляюцца сваякамі, знаходзіцца ў мяшаных кампаніях, зрабіў нелегальнымі танцы й публічныя музычныя выступы, паленьне жанчынамі цыгарэтаў у публічных месцах, язду на матацыклах разам мужчыны і жанчыны і г. д. Быў забаронены шэраг кнігаў і кружэлак – і нават зборнік палестынскіх казак. Быў узарваны аквапарк, раз-пораз адбываюцца выбухі каля бізнэсаў, што ўважаюцца за "недастаткова ісламскія". Быў закатаваны насьмерць уласьнік адзінай на ўсю Газу хрысьціянскай кнігарні, хоць Хамас адмаўляў сваю датычнасьць да злачынства. Колькасьць хрысьціянаў за 5 год панаваньня Хамасу скарацілася ўдвая, хоць хрысьціянства сярод арабаў Газы мае глыбейшыя гістарычныя карані, чым іслам.

Як вядома, Хамас у сваёй праграме абвесьціў мэтаю зьнішчэньне Ізраілю і ўхіляецца ад перагляду свайго стаўленьня, парушае дамовы аб замірэньні, праводзіць палітыку непрыняцьця "сіянісцкага рэжыму", хоць у той жа час ахвотна бярэ "сіянісцую" электраэнэргію, зерне, ваду, прадукты харчаваньня. Зьмянілася і тактыка супрацьстаяньня Ізраілю – стаўка робіцца на тэрарызаваньне цывільнага насельніцтва Ізраілю, правакаваньне збройнага адказу ізраільскай арміі, і скарыстаньне затым заходніх псэўдалібэральных мэдыяў для выкрыцьця "вайсковых злачынстваў сіяністаў". Мэтады таксама зьмяніліся – замест самагубцаў-бамбістаў у ход ідуць ракеты, раней самапальныя недакладныя начыньні свайго вырабу, цяпер – стандартныя баявыя ракеты іранскай і расейскай вытворчасьці. Да гэтага таксама дадаецца выкарыстаньне тунэляў як сродку набліжэньня да ізраільскіх населеных пунктаў і для перахоўваньня зброі й жывой сілы.

У чым жа сувязь тут зь беларускай гісторыяй? Справа ў тым, што менавіта на беларускай зямлі былі вынайдзеныя і абкатаныя нялюдзкія мэтады партызанскай вайны, калі цывільнае насельніцтва робіцца прыкрыцьцём для вайсковых дзеяньняў нерэгулярных вайсковых адзінак слабейшага боку ў канфлікце. У Другую сусьветную вайну партызаны адпрацавалі "ноў-хаў" несымэтрычнага вайсковага змаганьня, калі цывільнае насельніцтва сьведама падстаўлялася пад удар непрыяцеля. Гэта выконвала падвоеную задачу – дыскрэдытаваць дзеяньні непрыяцеля як барбарскія і антычалавечыя, і мабілізаваць найболей цывільных у свае шэрагі, зрабіць памагатымі партызанаў. Менавіта ўжываньне такой тактыкі савецкімі партызанамі выклікала тую трагедыю "вогненных вёсак", найбольш вядомай зь якіх стала Хатынь, якая была спаленая ў адказ за напад партызанаў на канвой акупантаў. Некаторыя савецкія партызанскія камандзёры заклікалі да зьмены тактыкі, да пазьбяганьня правакацыяў і наступных ахвяраў сярод мірнага насельніцтва. Але такія настроі ішлі супраць "генэральнай лініі" кіраванага з Масквы савецага партызанскага руху, і, натуральна, выніку ня мелі. У выніку ў Беларусі загінула каля 25% насельніцтва. Для параўнаньня, там дзе не было пашыранага партызанскага руху – у Летуве, Малдове, Латвіі, Эстоніі – загінула толькі каля 5-7% насельніцтва.

Далей тая партызанская тактыка была дапрацаваная ў Алжыры, Конга і Віетнаме. Не прашло гэта і па-за ўвагай Арганізацыі вызваленьня Палестыны (АВП). Удасканаленьне падступных мэтадаў маніпуляваньня жыцьцямі цывільных дзеля зьнеслаўленьня непрыяцеля набыло новае жыцьцё з разьвіцём тэлебачаньня і ўжо зусім надаўна – сацыяльных мэдыяў. Цяпер фабрыкаваньне трупаў "вызвольнымі рухамі", асабліва палестынскім, стала рабіцца ўсё больш цынічным і бессаромным. Ня менш цынічным стала паляваньне за трупамі розных заходніх мэдыяў. Журналісцкія факультэты сталі штампаваць прафэсійных левых прапагандыстаў, якія замест аб'ектыўнага асьвятленьня падзеяў у той жа Палестыне сталі займацца вышукваньнем "зьверстваў ізраільскай ваеншчыны", якіх фактычна не існуе, закрываючы вочы на рэальныя зьверствы АВП і Хамасу. Карцінка на экране, 5-хвілінны рэпартаж сталі мацнейшымі за калёны танкаў і эскадрыльлі самалётаў. Не ў малой ступені гэтаму спрыяе дактрына паліткарэктнасьці й мультыкультуралізму, што загадзя ўважае вінаватымі прадстаўнікоў заходніх дэмакратыяў пры любых канфліктах з прадстаўнікамі трэцяга сьвету і нябелых этнічных групаў (хаця арабы, дарэчы, па амэрыканскіх правілах перапісу насельніцтва лічацца за белых).

Другой рысай, што яднае Хамас і беларускі партызанскі рух, ёсьць кіраваньне з-за мяжы. Як некалі ў Маскве ня пёк агонь спаленых не без дапамогі партызанаў вёсак, так не пячэ народная бяда палестынскіх бонзаў ды іхных іранскіх лялькаводаў. Натуральна, што Ірану не баляць раны палестынцаў, і чым іх болей будзе зьнішчана ў антытэрарытычнай апэрацыі Ізраіля – тым лепей для прапаганды мэтаў Ірану і Хамасу. Маўляў, глядзіце, які благі сіянісцкі рэжым! Не перашкаджайце нам вырабляць зброю супраць яго, праводзіць тэракты, весьці прапаганду за дэлегітымізацыю Ізраілю. Нажаль, гэтыя падступныя заклікі былі пачутыя даверлівымі прадстаўнікамі заходніх дэмакратыяў. Наіўныя "змагары за справядлівасьць" на Захадзе выходзяць цяпер на шматтысячныя дэманстрацыі супраць Ізраілю – адзінай дэмакратыі на Блізкім Усходзе.

І гэта на руку "нашчадкам партызанаў" – рэжыму Лукашэнкі ў Беларусі і Пуціну ў Расеі. Хай там Захад разьбіраецца з Ізраілем, а мы тамчасам і далей будзем рабаваць свой народ, прыкруцім мацней апазыцыю, нападзем на суседа. Мэтадалёгія Сэктару Газа, запачаткаваная ў Беларусі, робіць транзітам поўны круг і вяртаецца на нашую гаротную Бацькаўшчыну.

**Віталь ЗАЙКА**

583.qxd 8/29/2014 1:56 AM Page 1 (1,1)



# "Галгатня пра ЗыШыА"

## Слова - срэбра, маўчаньне - золата

"Айлав'ю", – кожнай раніцы гавораць амэрыканцы сваім дзецям, калі адвозяць іх у школу. "Айлав'ю", – разьвітваецца муж з жонкаю на заканчэньне тэлефоннай размовы. "Айлав'ю", – абменьваецца пацалункамі пара старычкоў, якія, адмовіўшы супольную малітву, садзяцца насупраць мяне ў сталоўцы, каб пачаць штодзённы абед.




А дзе ва ўсім гэтым беларусы? Гэта ж у нашай мове ёсьць ажно два словы, якія выражаюць гэтае пачуцьцё: любіць і кахаць. І хоць літаратурныя бюракраты надалі ім нават розныя адценьні, гэтыя словы ў нашым жыцьці адносна рэдкія. Ці то мы нейкія нячулыя, нясьмелыя, а мо нават зацьвярдзелыя душой? Няўжо мы кахаем менш чым іншыя? А можа проста беларусы ашчадныя на словы?

Іншыя народы кажуць "bon appetit", "smacznego", "приятного аппетита". А нашае "смачна есьці" ну зусім не гучыць. Не, ня ў пляне правільнасьці ці мілагучнасьці, з гэтым усё ў парадку, а ў пляне таго, што я, напрыклад, ніколі нічога падобнага ў жывой мове беларусаў ня чуў. Жагнаньне, амаль рытуальнае разразаньне хлеба нажом да грудзей было, а вось непатрэбных словаў – ніколі.

І тосты нашыя кароткія, і звароты простыя, і рытуалы няхітрыя, і нават цішыня ў нас атрымоўваецца шматмоўнай. Прамоваў у стылі "Адважнага сэрца", у якіх так горача замілаваныя амэрыканцы, я ўпэўнены, у нас не было ні пад Грунвальдам, ні пад Воршай. Сячы дык сячы, любіць дык любіць. Словы тут проста залішнія.

А гаварыць мы будзем тады, калі ўсе ўрэшце змоўкнуць...

**Віталь ВОРАНАЎ**

## Віншаваньне архіяпіскапу Юрыю (Э. Рыжаму) з нагоды 80-годзьдзя

Дарагі Ўладыка, мы ўсе ведаем Вас як нязломнага патрыёта Беларусі і змагара за нацыянальную беларускую царкву на Бацькаўшчыне, якому Бог даў зрабіць у гэтай справе ці не найболей за каго іншага ў гэтай галіне. Ведаем Вас таксама як актыўнага сябра нашай арганізацыі — Згуртаваньня "Пагоня".

Віншуем Вас з юбілеем і жадаем моцнага здароўя, сілаў і аптымізму, плёну ў Вашай душпастырскай справе. Жадаем таксама, каб Вы пабачылі вольную і дэмакратычную, сапраўды беларускую Бацькаўшчыну — вызваленую ад дыктатуры і русыфікацыі Беларусь.

Дай Божа сто год!

***Ад імя сябраў Беларуска-Амэрыканскага Згуртаваньня "Пагоня" Віталь ЗАЙКА, старшыня***

### Уплаты ў Згуртаваньне Ñêëàäê³ é àõâÿðàâàíí³:

**М. Івашчанка ................60**
**А. Харчэўка ...................60**
**А. Шайкоўскі .................60**
**Усім шчыры дзякуй!**

### Уплаты ў аддзел шліце на адрас:

*P. O. Box 572*
*New York, NY 10113*
**Чэкі выпісвайце на імя**
*Viktar Yedzinovich.*

*Паважаныя **В. Мытнік, М. Папкова,** калі ласка, паведаміце рэдакцыі вашыя дакладныя паштовыя адрасы.*

## Наступны сход

### Беларуска-Амэрыканскага Згуртаваньня "ПАГОНЯ"

адбудзецца ў суботу **20 верасьня 2014 г.** *(часова, толькі ў верасьні, гэта будзе не другая, а трэцяя субота месяца)* на прыродзе ў Цэнтральным парку на Мангэтане.

Чакаецца выступ беларускага навукоўца з Швэцыі **А. Катлярчука**.

Збор **а 10.30 раніцы** на скрыжаваньні ***72-й вуліцы і 5-й авэню*** пры ўваходзе ў Парк.

Сход пройдзе на пагорку ля возера з чаўнамі ***(The Lake with Boating)*** на поўнач ад ***Terrace Drive***.

### Ахвяравалі на выданьне бюлетэня *Весткі й Паведамленьні*:

**М. Івашчанка ...............30**
**А. Харчэўка ...................30**
**А. Шайкоўскі .................30**
**Шчыры дзякуй!**

*Падпісацца на бюлетэнь могуць усе зацікаўленыя даслаўшы аплату гадавой падпіскі ($30) на адрас:*

***Marat Klakotski***
***P. O. Box 3225***
***Farmingdale, NY 11735***

*Чэкі з адзнакаю **"Весткі"** выпісвайце на імя скарбніка Згуртаваньня "Пагоня" **Viktar Yedzinovich**.*